# Калі ў душы ўсё выспела

**У Выдавецкім доме «Звязда» пабачыла свет кніга нарысаў пісьменніка Расціслава Бензерука «Сардэчны абярэг», прысвечаная вядомым у літаратуры асобам, з якімі творца з Жабінкі сустрэўся і пасябраваў на ўсё жыццё.**

З маленства чалавек шукае свае дарогі, якія выбрукаваны ўвагай і клопатам настаўнікаў. За кожны значны крок да свайго літаратурнага поспеху вядомы дзіцячы пісьменнік, публіцыст, паэт Расціслаў Бензярук удзячны тым, хто быў спагадлівы да яго літаратурнага лёсу, — старэйшаму брату Паўлу Бензеруку, выдатным творцам Уладзіміру Калесніку, Янку Брылю і Васілю Вітку.

З цеплынёй і ўдзячнасцю Расціслаў Мацвеевіч згадвае на старонках кнігі сустрэчы з Цімохам Васільевічам Крысько, вядомым у літаратуры пад імем Васіля Віткі, у раздзеле «Жыў на свеце дзед Васіль».

Уладзімір Калеснік — яшчэ адна асоба, якая паўплывала на лёс Расціслава Бензерука, які прызнаецца: «У студэнцкія гады мне выпала бачыць Мележа і Шамякіна, Брыля і Навуменку, Караткевіча і Барадуліна. Нейкім сваім унутраным чуццём Уладзімір Андрэевіч Калеснік улавіў, што я магу выступаць пры абмеркаванні кніг».

Вельмі прыемна адкрываць для сябе любімых пісьменнікаў не па сухіх энцыклапедычных даведках, а па аповедах пра іх чалавекалюбства, жывым успрыманні рэчаіснасці. Расціслаў Мацвеевіч расказвае пра сваіх педагогаў шчыра і проста, дае магчымасць напоўніцца іх сардэчнай цеплынёй, якая саграваe праз дзесяцігоддзі.

Маладым літаратарам, ды і моладзі розных прафесій будзе цікава прасачыць рост пісьменніка-пачаткоўца, расказаны праз гады ўжо сталым творцам. Аўтар дазваляе ўявіць, як пад шамаценнем дубоў вырастае таленавіты парастак, як шліфуецца недаспелая творчасць і набірае абароты майстэрства, а за гэтым прыходзіць і прызнанне.

Расціслаў Бензярук успамінае дзень, калі ўпершыню даслаў у сталічны часопіс свае творы і Янка Брыль з усяго напісанага адабраў апавяданне «Ленкин характер», падказаў дапрацаваць твор і адправіць яго ў газету «Зорька». Гэта стала стартам для маладога пісьменніка.

Аўтар кнігі «Сардэчны абярэг» прыгадвае мудрыя парады, што давалі пачаткоўцам мэтры. Усё сказанае імі гучыць актуальна і сёння.

— Калісьці малым куплялі адзенне навырост, бо за адзін год не зносіш. Для дзяцей і пісаць трэба гэтак жа добра, зразумела, як і для дарослых, але крыху з хітрынкаю, — вучыў Васіль Вітка.

На старонках сваёй кнігі Расціслаў Мацвеевіч паказвае, як самое жыццё выпісвае цікавыя сюжэты, а таму і розныя супадзенні ў творах з жыццёвымі рэаліямі зусім не выпадковыя. У замалёўцы «Цесны свет» Расціслаў Бензярук пераносіць нас у 1990-я, калі ў яго сям'і здарылася няшчасце: дачка Наташа трапіла ў аўтакатастрофу. Сярод тых, хто прыйшоў на дапамогу, аказаўся таленавіты хірург Вісарыён Крысько, як высветлілася пазней — сын Васіля Віткі. «Сапраўды, калісь Васіль Вітка дапамагаў мне, дзіцячаму пісьменніку, станавіцца на ногі, а цяпер яго сын ратаваў маю дачку», — згадвае Расціслаў Бензярук. А яшчэ праз бяду, праз пільны позірк з Вечнасці Васіля Віткі ўдалося забыць і былыя крыўды — памірыцца са старой знаёмай.




Ва ўспамінах Расціслава Мацвеевіча хаваюцца розныя інтрыгоўныя гісторыі. Аўтар распавядае, як узнік герой часопіса «Вясёлка» — Вася Вясёлкін, чаму Вітка назваў свайго сына Вісарыёнам, каму і пры якіх абставінах Расціслаў Бензярук падарыў у 1975 годзе першы экзэмпляр сваёй дэбютнай кнігі…

У раздзеле «Заўжды ў сорак першым» аўтар знаёміць чытача з Алесем Махначом і Раманам Левіным. Гэтыя пісьменнікі сталі жывымі сведкамі ваенных падзей. З Алесем Махначом Расціслаў Бензярук пазнаёміўся ў 1989 годзе, калі ў Жабінцы Брэсцкай вобласці ладзілася свята кнігі і беларускага фальклору. Гэта сустрэча не стала апошняй. Пісьменнік з Жабінкі дасціпна занатаваў успаміны слыннага літаратара і падзяліўся сваімі ўражаннямі ад сустрэч. Другая гісторыя раздзела і носіць назву «Сардэчны абярэг». Гэткім абярэгам стаў медальён з выявай Мадонны, які павесіла на шыю Рамана Левіна яго прыемная маці Флорыя Будзішэўская, ратуючы ад расправы яўрэйскага хлопчыка, якому было суджана выжыць і стаць пісьменнікам. Жанчына ахвяравала сваім жыццём дзеля жыцця бліжняга свайго. Яна перадала дзіцяці частку сваёй бязмежнай любові, трывогі і веры ў хуткую перамогу перад тым, як сысці ад рук катаў у Вечнасць.

Паэту-земляку Івану Арабейку Расціслаў Бензярук прысвяціў аповесць-эсэ «Найбольш зямны». Расціслаў Мацвеевіч прааналізаваў Арабейкаву паэзію, багатую фарбамі і шчырасцю. Дарэчы, Іван Сяргеевіч першым напісаў верш, прысвечаны вогненнай вёсцы Драмлёва, спаленай разам з людзьмі 11 верасня 1942 года.

Іншага свайго земляка, паэта Васіля Гадульку, Расціслаў Бензярук запомніў «сціплым паэтычным рупліўцам». Цяжкі лёс напаткаў лірыка, які нарадзіўся ў беднай сялянскай сям'і, але быў здольным да навук. Гартаючы старонкі кароткага, але яркага паэтычнага жыцця земляка, пісьменнік паказвае, наколькі безабаронны паэт перад абставінамі, як моцна можа крывавіць чыстая душа самотнага анёла. «Такога паэта нельга пакідаць на волю лёсу, бо ён адзначаны боскай ласкаю», — сказаў калісьці паэт Васіль Сахарчук. Здаецца, блізкія людзі гэта разумелі, але не зберaглі: розныя перыпетыі рвалі крылы Васіля Гадулькі, яго сэрца трывожылася і пакутавала ў адзіноце.

У аповесці-эсэ «Святло сонечнай усмешкі» Расціслаў Бензярук успамінае калегу па пяры з вёскі Сташаны Анатоля Шушко, які заўчасна пайшоў з жыцця ў 2018 годзе. Беларускую мову і літаратуру ў Сташанах у сярэдніх і старэйшых класах выкладаў Мікола Купрэеў, які адразу прыкмеціў таленавітых хлапчукоў Анатоля Шушко і Міколу Антаноўскага. Расціслаў Мацвеевіч згадвае жыццёвы і творчы шлях Анатоля Шушко, яго універсітэцкіх сяброў, захапляецца яго самабытнымі вершамі, у якіх дыяментамі высвечваліся дыялектныя словы: «заля» (замест «зала»), «пархумія», «льга», «хвайны», успамінае сумесныя вандроўкі па Беларусі. Надзелены вялікім талентам паэтызаваць жывыя карцінкі жыцця, Анатоль Шушко запомніўся сябрам сваёй добрай усмешкай, ён быў заўсёды адкрыты людзям, весяліў сваімі аповедамі.

Напрыканцы — эсэ пад агульнай назвай «Добры дзень і бывай!..», якія аўтар называе «невялічкай трылогіяй». Прамяністыя жыцці беларускіх паэтаў Леаніда Якубовіча, Анатоля Серпантовіча і Уладзіміра Шурпы спыніліся на ўзлёце. Успамінаючы Леаніда Якубовіча, Расціслаў Мацвеевіч згадвае адну з дзвюх яго мініяцюр, уключаную ў першы і адзіны зборнік паэта, што пабачыў свет праз дзевяць гадоў пасля яго смерці. «Жыта заўсёды жнуць, калі яно добра выспее, калі зярняты, здаецца, звоняць пад жнівеньскім ветрыкам. Так павінна быць і ў пісьменнікаў: бярыся за пяро толькі тады, як адчуваеш, што ўжо ўсё выспела ў душы для новага твора — так і звоніць добрымі вобразамі, добрымі думкамі».

І гэта сапраўды так: творчыя ўсполахі і набыткі прыходзяць да аўтара так жа ціха, як спее жыта. І ў моманты творчага жніва — калі выдаюцца зборнікі, прыходзіць увага ад чытачоў і павага ад паплечнікаў, узнікае разуменне сапраўднай ролі паэта: вучыць чалавечнасці, у рыфмах, эпітэтах, метафарах раскрываць прыгажосць душы і наваколля, такога на першы погляд звыклага, але самага каштоўнага, роднага з маленства.

Цудоўная парада для маладых аўтараў праходзіць чырвонай ніткай праз усе нарысы Расціслава Бензерука, які вучыць быць аказным за сваю творчасць, заставацца самім сабой і верным мастацкаму слову.

**Таццяна ДЗЕМІДОВІЧ**



Чытацкі дзённік
Навума Гальпяровіча

# Трыадзінства Віктара Гардзея

*…Ля ціхай затокі на плёсе*
*Ёсць шчасце згадаць аб любві.*
*Сваіх я не высушу вёсел —*
*Плыві, мая лодка, плыві!*
*Крычаць патрывожана гусі*
*У мройны азёрны разліў.*
*А карта маёй Беларусі —*
*Як луг, што блакітна зацвіў…*

Здаўна зацікавіўся вершамі Віктара Гардзея. Яшчэ тады, калі ён, супрацоўнік ганцавіцкай газеты, не быў у Мінску, а вершы ўжо шырока публікаваліся ў рэспубліканскім друку.

Першая кніжка «Касавіца» выйшла ў 1975 годзе. Паэту не было яшчэ і трыццаці. Гэта сёння дэбютанты стартуюць і ў шэсцьдзесят гадоў. А творы маладога Гардзея ўжо тады вызначаліся адметным голасам, шчырасцю і натуральнасцю.

*Зубры ідуць, а побач зубраня.*
*Світальны змрок радзее ў Белавежы.*
*І зоркі тухнуць, як агні начлежак*
*Над Белавежай на пачатку дня.*

Былі ў першым зборніку і трацыйныя тады для пачаткоўцаў «паравозікі»-водгукі на надзённыя для таго часу тэмы і падзеі, але вока чаплялася за нязмушаную шчырасць і замілаванасць роднай зямлёй, блізкімі палескімі краявідамі.

Прыцягвала высокая культура і радка, вобразнасць, характэрная для сапраўднай паэзіі.

І мае спадзяванні ўбачыць новыя цікавыя кнігі паэта апраўдаліся.

«Незабудкі азёр», «Узрушэнне», «Дзікая пчала»… Віктар ужо быў паўнапраўным удзельнікам літаратурнага працэсу. Стаў пісаць прозу, але вершы заставаліся як адхланне, як светлыя сполахі:

*Восені кладзецца ліст журботны*
*На сухія з чэрвеня брады.*
*Неўпрыкмет у вырай незваротны*
*Птушкамі ляцяць мае гады.*
*Прамільгнулі чайкі дзён дзіцячых*
*Меней стала ў справах мітусні.*
*Прашумелі галкі дзён юначых —*
*Болей стала ў сэрцы цішыні.*

У паэзіі Гардзея няма жадання вызначыцца пэўным эксперыментам, гучнасцю, эпатажам. Яго вершы ў рэчышчы традыцыйнай беларускай паэзіі, але найлепшых яе здабыткаў.

Паэтычны зборнік «Трыадзінства» выйшаў у выдавецтве «Мастацкая літаратура» ў серыі «Залатое пяро» з рэпрадукцыяй карціны Шышкіна, нібы падкрэсліваючы гэтую традыцыйнасць, бо Шышкін для некаторых якраз апалагет такога традыцыйнага пазачасавага мастацтва. Не ўсім сёння блізкі і мастак ды традыцыйная паэзія ўвогуле, і творчасць Віктара Гардзея ў прыватнасці.

Але ўсё ж сапраўднае мастацтва перажывае часы і мітусню і застаецца шчымлівай і шчырай нотай, якая кранае душу:

*Адно імгненне — вочы, вусны*
*Адчайна ў вечнасць адплылі,*
*Сучок пад яблыняю хруснуў,*
*І — ціха, ціха на зямлі…*

Такая паэзія патрэбна і ў нашы вірлівыя часы. І ў патаемныя хвіліны радасці і светлага смутку, калі ты нібыта сам-насам з вечнасцю, яна кладзецца шчымлівай мелодыяй, якую хочацца слухаць і слухаць.

І сярод гэтых яе патаемных гукаў ёсць і простыя, але глыбокія і шчырыя радкі майго сучасніка Віктара Гардзея.